ецца спосабам лагічнай аперацыі ўключэння. Яны сустракаюцца ў канструкцыях з простай мовай, якая «ўключаецца» ў семантычную структуру сказа і ўказвае на значэнне асобы: *І ўздых, як быццам боль які: – // У лесаруба хлеб цяжкі! – І да мяне: – // А ты, блазно, // Чаго угледзеўся ў акно?* (П. Броўка). Выражэнне персанальнасці на аснове логіка-семантычнага ўзаемадзеяння заўсёды абумоўлена сэнсавай спалучальнасцю. Аднак у большасці эліптычных канструкцый катэгорыя персанальнасці не актуалізуецца: *Паўзком – на лінію!* (А. Дзялендзік).

### 1.3.4 Кампенсаторная функцыя парадыгмы структурна-сінтаксічных мадыфікацый

**Параметры тыпалогіі поліфункцыянальнасці словаформ.** Важную ролю ў выяўленні моўных механізмаў, якія забяспечваюць функцыянаванне канструкцый з эліпсісам дзеяслова, адыгрываюць фактары, што вызначаюць характар поліфункцыянальнасці словафрм. У мовазнаўстве функцыянальны дыяпазон словаформ даследаваўся выключна на матэрыяле дынамічных сінтаксічных адзінак (Г. А. Золатава, А. М. Мухін, М. У. Усевалодава). Лічым мэтазгодным праводзіць сістэматызацыю на аснове парадыгмы структурна-сінтаксічных мадыфікацый *эліптычная канструкцыя – вытворная канструкцыя – канструкцыя з імпліцытнай семантыкай*, што ахоплівае адзінкі дынамічнага сінтаксісу і ў якой з'ява поліфункцыянальнасці набывае выражаны характар. Пры гэтым у функцыянальны дыяпазон словаформы ўключаліся не толькі сінтаксічныя, а і семантычныя функцыі.

Асноўным параметрам тыпалогіі выступае спосаб ідэнтыфікацыі семантыкі словаформы ў парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый. Структураванне кампенсаторнай прыкметы дазваляе вылучыць тыпалагічна істотныя прыкметы – спосабы ідэнтыфікацыі семантыкі словаформы: трансфармацыйную парадыгму, кантэкстуальнае і логіка-семантычнае ўзаемадзеянне кампанентаў і характар сінтаксічных сувязей і адносін – канстантны або пераменны, на аснове якіх створана адпаведная сістэматызацыя (класіфікацыя). Граматычная форма словаформы выступае базавай адзінкай сістэматызацыі. Падобная метадалогія дазваляе не толькі ўстанавіць функцыянальны дыяпазон словформ, але і сістэматызаваць фактары іх поліфункцыянальнасці ў адпаведнасці з тыпалагічна істотнай прыкметай.

Аснову колькасных параметраў складае функцыянальны дыяпазон словаформ у розных структурна-сінтаксічных мадыфікацыях. Высокая ступень прадуктыўнасці словаформы (здольнасць выконваць розныя семантычныя ролі і сінтаксічныя функцыі) сведчыць пра стабільны характар сінтаксічнай з'явы.

Ідэнтыфікацыя семантыкі словаформы (канструкцыйна-аманімічнай) у адпаведнасці з трансфармацыйнай парадыгмай дазваляе кваліфікаваць фактар

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

поліфункцыянальнасці як **канструкцыйна-трансфармацыйны**. Падобны фактар прыдатны для сістэматызацыі функцыянальнага дыяпазону словаформ у парадыгме мадыфікацый *эліптычная канструкцыя – вытворная сінтаксічная канструкцыя.* Для пабудовы функцыянальна-сінтаксічнай парадыгмы словаформы патрабуецца адпаведная кваліфікацыя сінтаксічнай адзінкі на аснове тыпалагічна істотнай прыкметы, у якасці якой выступае канстантны характар сінтаксічнай сувязі і адносін і пераменны характар граматычных форм. Канстантны характар сінтаксічных сувязей і адносін уласцівы для ўсіх элементаў парадыгмы – канструкцый з кантэкстуальным эліпсісам і ўсіх відаў сінтаксічных пераўтварэнняў – як са зменай, так і без змены класа слоў.

Кампенсацыя сэнсу ў канструкцыях з кантэкстуальным эліпсісам надзвычай выразная: апушчаны дзеяслоў дубліруецца сродкамі кантэксту: *Маці пайшла ў хату. Хутка і дзеці – за ёй* (Г. Марчук). Ідэнтыфікацыя семантыкі словаформы (а значыць, і кампенсацыя сэнсу) у вытворных канструкцыях – працэс больш складаны. Сінанімічныя сінтаксічныя пераўтварэнні дазваляюць кампаненту набываць розныя граматычныя формы (роднага, давальнага, творнага іншых склонаў) і змяняць лексіка-граматычны клас. Поліфункцыянальнасць словаформы пры такіх умовах набывае выразны характар, і, адпаведна, яе функцыянальны дыяпазон будзе найбольшы. Напрыклад, словаформа ў форме вінавальнага склону *ў россып* паводле фармальных прыкмет адносіцца да залежных. Аднак трансфармацыйная парадыгма канструкцыі *Зноў стук. Ледзяны. // Халодны. Бы ўяўны. // Так б'е калатун. // І думкі –* ***ў россып*** (Т. Бондар) указвае на адсутнасць рэферэнтных якасцей і наяўнасць прэдыкатыўных: *Думкі – ў россып ← Думкі рассыпаюцца* (прэдыкат пры гэтым акцыянальны). У адносіны канструкцыйнай поліфункцыянальнасці названая канструкцыя ўступае з эліптычным сказам тыпу *Маці –* ***у хату***. Сінтаксічныя адносіны і сувязь у абедзвюх канструкцыях захоўваюцца, нягледзячы на сінанімічныя пераўтварэнні, і кваліфікуюцца як прэдыкатыўныя / каардынацыя (1) і падпарадкавальная / прасторавыя (2). Функцыянальны дыяпазон словаформ будзе наступным: прэдыкат (акцыянальны) – лакатыў. Ён можа быць папоўнены за кошт уключэння ў аналіз эліптычных канструкцый з іншымі тыпамі прэдыкатаў, якія вызначаюць семантычную функцыю словаформы.

Тыпалагічна істотнай прыкметай выступае таксама пераменны характар граматычных форм у вытворных канструкцыях, які і стварае спрыяльныя ўмовы для іх поліфункцыянальнасці. Напрыклад, у аддзеяслоўных наміналізаваных канструкцыях прэдыкат можа набываць форму вінавальнага склону: *То смех, то слёзы* (Т. Бондар), творнага: *І вясёла ў нас, і жыва, // Адпакутвалі, і годзе – // Хто –* ***за вышыўкай ці швівам,*** *// Хто ад кніжак не адходзіць* (П. Броўка) (*за вышыўкай ← вышывае*) і інш. Неабходна адзначыць, што значны функцыянальны дыяпазон словаформ у парадыгме *эліптычная – вытворная* канструкцыі абу-

РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ

моўлены характарам пераўтварэнняў (са зменай і без змены класа слоў), пры якіх прэдыкат набывае практычна любую форму назоўніка або прыметніка.

Канструкцыйна-трансфармацыйны тып поліфункцыянальнасці словаформ набывае ўніверсальны характар у сінтаксічнай сістэме беларускай мовы. Ступень прадуктыўнасці словаформы ў падобных парадыгмах найбольшая. У сінтаксічнай сістэме беларускай мовы назіраюцца два віды парадыгм структурна-сінтаксічных мадыфікацый:

– эліптычная канструкцыя – вытворная канструкцыя без змены класа слоў. Характарызуецца тым, што суб’ект і прэдыкат захоўваюць прыналежнасць да лексіка-граматычнага класа і змяняюць толькі форму – пераўтвараюцца часткова;
– эліптычная канструкцыя – вытворная канструкцыя са зменай класа слоў. Характарызуецца зменай лексіка-граматычнай прыналежнасці прэдыкатыўнага кампанента.

Кваліфікацыйнымі прыкметамі ў абодвух выпадках выступаюць кантэкстуальныя сродкі і наяўнасць або адсутнасць трансфармацыйнай парадыгмы, напрыклад: *Ён – з **папаўнення**... Малады...* (А. Дудараў) ← *Ён прыбыў з **папаўнення*** – эліптычная канструкцыя і *Прызнаюся у варварстве сваім, // Бо я – з тых **мужыкоў**, // Якія толькі рукам вераць* (Максім Танк) ← *Я той **мужык*** – вытворная канструкцыя.

Важным фактарам поліфункцыянальнасці словаформ у такіх парадыгмах выступае ступень прадуктыўнасці граматычнай формы, тып прэдыката і від пераўтварэння. Выяўлена, што дыяпазон семантычных функцый словаформ прама прапарцыянальны колькасці іх сінтаксічных функцый. Найбольшую колькасць функцый ахопліваюць словаформы ў форме меснага і роднага склону, што абумоўлена здольнасцю выконваць практычна ўсе сінтаксічныя функцыі і семантычныя ролі – ад прэдыкатыўных да атрыбутыўных. Калі да гэтага дадаць «новыя» ролі, набытыя ў выніку сінанімічных пераўтварэнняў, і ўлічыць колькасць тыпаў прэдыкатаў і сфер праяўлення прэдыкатыўнай прыметы, то атрымліваецца значны функцыянальны дыяпазон. Напрыклад, словаформа ў форме меснага склону *у + назоўнік* мае значны функцыянальны дыяпазон (табліца).

**Табліца – Функцыянальны дыяпазон словаформы у + *наз.***

| Форма словаформы | Характар базавых сінтаксічных пераўтварэнняў | Тып прэдыката | Семантычная функцыя | Ілюстрацыі |
|---|---|---|---|---|
| **Назоўнік М. скл. *у + наз.*** | Эліпсіс у перафразаванай канструкцыі | Акцыянальны | Фінітыў - 2 | *Шчасце знойдзем у **працы**. Бяссмерце – **у дзецях** і **Айчыне*** («Чырвоная змена») |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Працяг

| Форма словаформы | Характар базавых сінтаксічных пераўтварэнняў | Тып прэдыката | Семантычная функцыя | Ілюстрацыі |
|---|---|---|---|---|
| | Вытворная канструкцыя без змены класа слоў (назоўнік М. скл. ← назоўнік Н. скл.) | Рэляцыйны | Прэдыкат | *І бяссмерце* – ***у дзецях*** *і* ***Айчыне*** (Т. Бондар) |
| | Эліптычная канструкцыя | Экзістэнцыяльны | Лімітатыў | *Усё мае працяг жыцця: // Нітка – у туга навітым* ***клубку****, // Дарога –* ***у імкненні*** *за небасхіл, // Песня –* ***у падгаласах*** *рэха, // Зерне –* ***у хлебе*** *надзённым, // Любоў –* ***у*** *сонечнай* ***усмешцы*** *дзіцяці* (Максім Танк) |
| | Вытворная канструкцыя без змены класа слоў (назоўнік М. скл. ← назоўнік Н. скл.) | Рэляцыйны | Прэдыкат | *Шчасце* ***ў імкненні*** *наперад* («ЛіМ») |
| | Эліптычная канструкцыя | Экзістэнцыяльны | Лакатыў | ***У вёсках*** *– і школы, і бібліятэкі* («Савецкая вёска») |
| | Эліпсіс у перафразаванай канструкцыі | Рэляцыйны | Лімітатыў | *Сон – ён толькі сон, не болей. // Сіла* – ***у*** *вечнай* ***празе*** *волі. // Толькі б ведаць міг, // Калі адарвацца ад зямлі* (Т. Бондар) |
| | Вытворная канструкцыя без змены класа слоў (назоўнік М. скл. ← назоўнік Н. скл.) | Характарызацыйны | Прэдыкат | *Ні старое гміны, // Знік і войт-забойца – //* ***У сям'і*** *адзінай – чырвонаўсходцы* (П. Броўка) |
| | Эліптычная канструкцыя | Статыўны | Лімітатыў | ***У*** *іх* ***позірках*** *– горыч, і боль, і яшчэ штосьці такое, ад чаго на душы ў Зязюлі мотaшна* (А. Дзялендзік) |
| | Эліптычная канструкцыя | Экзістэнцыяльны | Лакатыў | *У палату зараз не заходзьце.* ***У Міхала*** *жонка* (В. Шымук) |



РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ

Працяг

| Форма словаформы | Характар базавых сінтаксічных пераўтварэнняў | Тып прэдыката | Семантычная функцыя | Ілюстрацыі |
|---|---|---|---|---|
| | Вытворная канструкцыя са зменай класа слоў (назоўнік ← прыметнік) | Характарызацыйны | Прэдыкат | *Не бачыш, што* ***ў яго (Васіля)*** *– жонка, дзіця ў яго* (І. Мележ) |
| | Вытворная канструкцыя без змены класа слоў (назоўнік М. скл. ← назоўнік Н. скл.) | Рэляцыйны | Прэдыкат | *Сцяпан –* ***у салдатах****. Тры гады ўжо* (З. Бядуля) |
| | Эліптычная канструкцыя | Экзістэнцыяльны | Лакатыў | *Дзеці –* ***у хаце*** (Г. Марчук) |
| | Перафразаваная канструкцыя | Акцыянальны | Прэдыкат | *Ён пазірае прагна ў вышыню, // Далоньку сцісну цёплую ў знямозе, // Зманю свайму дзіцяці ўпершыню, // Сказаўшы, што жураўлікі –* ***ў дарозе*** (Р. Баравікова) |
| | Эліптычны сказ з імпліцытнай семантыкай | Характарызацыйны | Характарызацыйная прэдыкатыўная прыкмета | *Закахалася яна. А ён –* ***у інтэрнаце*** (А. Макаёнак) |
| | Вытворная канструкцыя са зменай класа слоў (адпрыметнікавая наміналізацыйная) | Статыўны | Прэдыкат | *Чалавек, якога правяраюць, –* ***у разгубленасці*** (А. Макаёнак) |
| | Вытворная канструкцыя са зменай класа слоў (адпрыметнікавая наміналізаваная) | Характарызацыйны | Прэдыкат | *Глядзіць, Тамаш насустрач раптам. // Відаць, ён толькі што з касьбы: //* ***У пыле*** *ўся яго апратка // І твар ад поту аж рабы* (Н. Гілевіч) |
| | Вытворная канструкцыя са зменай класа слоў (аддзеяслоўная наміналізаваная) | Акцыянальны | Прэдыкат | *О, як тут ціха, дзіўныя малюнкі. // І строгія партрэты – ўсе* ***ў маўчанні*** (Р. Баравікова) |

РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ

Заканчэнне

| Форма словаформы | Характар базавых сінтаксічных пераўтварэнняў | Тып прэдыката | Семантычная функцыя | Ілюстрацыі |
|---|---|---|---|---|
| | Вытворная канструкцыя са зменай класа слоў (аддзеяслоўная наміналізаваная) | Акцыянальны | Аб’ект | ***У зброі*** *надзвычайная патрэба. І дровы... // Гарады спавіў мароз* (Г. Бураўкін) |
| | Эліптычная канструкцыя | Экзістэнцыяльны | Лакатыў | ***У хаце*** *– дзеці: Лёдзя з мужам...* (Н. Гілевіч) |
| | Эліпсіс у перафразаванай канструкцыі | Характарызацыйны | Дэскрыптыў | ***І ў позірку*** *– цяжкі падзол* (В. Зуёнак) |
| **Усяго:** | **Тыпаў сінтаксічных канструкцый: 6** | **Тыпаў прэдыкатаў: 5** | **Семантычных функцый: 6** | |

Такім чынам, устаноўлена, што сінтаксічныя сінанімічныя пераўтварэнні здольны сфарміраваць значны функцыянальны дыяпазон словаформы, нягледзячы на канстантны характар сінтаксічных адносін. Унікальны характар набывае словаформа, калі суадносіны яе формы і функцыі не маюць сістэмнага характару, а абумоўлены метрыка-рытмічнай арганізацыяй верша: *А тут – у белі каласоў // Яна* ***красуняй босай****. // Яна свая паміж вятроў, // Між тумаоў і расаў* (П. Броўка). Названыя канструкцыі з характарызацыйнымі прэдыкатамі аманімічных форм не ўтвараюць. Поліфункцыянальны характар словаформ у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый *эліптычная – вытворная канструкцыі* рэгулюецца інтэрпрэтацыйнымі моўнымі механізмамі, якія і вызначаюць від сінанімічных пераўтварэнняў.

Кампенсаторныя ўласцівасці **кантэкстуальна-катэгарыяльных** фактараў заключаюцца ў кантэкстуальнай абумоўленасці катэгарыяльных змен (змена сінтаксічнай і семантычнай функцый словаформы) у парадыгме *эліптычная – эліптычная канструкцыі*. Тыпалагічна істотнымі прыкметамі ў дадзенай сістэме выступаюць характар сінтаксічнай сувязі і адносін – канстантны (пры змене семантычнай функцыі і захаванні сінтаксічнай) або пераменны (пры змене семантычнай і сінтаксічнай функцый адначасова) і від структурна-сэнсавага паказчыка.

Від катэгарыяльных змен са зменай семантычнай функцыі і з захаваннем сінтаксічнай характарызуецца канстантным характарам сінтаксічных сувязей і адносін. Функцыянальны дыяпазон сінтаксем абумоўлены тыпам прэдыката і сферамі яго праяўлення. Тып прэдыката, у сваю чаргу, вызначаецца на аснове

РЕПОЗИТОРИЙ•БГПУ

тыпалагічна істотнай прыкметы – віду структурна-сэнсавага паказчыка. Напрыклад, паказчыкам сінтаксічных і семантычных функцый словаформы ў форме творнага склону (*з* + назоўнік) выступаюць пераважна залежныя кампаненты: яны размяжоўваюць тып прэдыката, а разам з тым і семантычныя функцыі словаформ: рэлянт ад каагенса: – *Вы б дзядзько, етыя штучкі з якой* ***равесніцай*** *сваёй. З цёткай Сарокай бы* (І. Мележ); – *Вы б з* ***равесніцай*** *сваёй. У адным пакоі. Удваіх весялей будзе, – раіла цётка маладзенькай дзяўчыне, відаць, студэнтцы* (А. Бялевіч) або сілу ад сродку: *Прайшлася віхура. Дрэвы паваліла долу. Парк засыпала гразёю і пылам. Сцежкі – сухім* ***лісцем і ламанымі веткамі*** (Т. Хадкевіч); *Настаўнікі і вучні папрацавалі плённа. Пазасыпалі сцежкі пілавіннем. Стадыён –* ***зямлёй*** *і пяском* («Савецкая вёска») і інш.

Пераменны характар сінтаксічных сувязей і адносін уласцівы для парадыгм, дзе словаформы (пераважна іменныя) змяняюць іерархічны статус (могуць быць як прэдыкатыўнымі, так і залежнымі). Кампенсаторную функцыю ў такіх парадыгмах выконваюць кантэкстуальныя сродкі – прэдыкатыўныя або залежныя кампаненты, якія фарміруюць адпаведныя сінтаксічныя сувязі і адносіны. На базе пэўных сінтаксічных сувязей і адносін будуецца семантыка-сінтаксічная парадыгма іменных словаформ. Найбольшы функцыянальны дыяпазон набываюць словаформы іменнага тыпу (4) або інфінітывы (3), што абумоўлена іх здольнасцю ахапіць найбольшую колькасць сінтаксічных функцый (ад прэдыкатыўнай да атрыбутыўнай). Эліпсіс дзеяслова ў большасці выпадкаў нейтралізуе сінтаксічныя сувязі і адносіны, таму ў працэсе функцыянавання дамінантны характар належыць паказчыку сінтаксічных сувязей і адносін, ролю якога выконваюць кантэкстныя сродкі: экспліцытна выражаныя дзеяслоўныя выказнікі або залежныя кампаненты. Натуральна, што сінтаксічныя сувязі задаюцца названым паказчыкам і абумоўлены яго характарам – гэта і вызначае сінтаксічную функцыю залежнай словаформы. Семантычная функцыя словаформы вызначаецца тыпам прэдыката або сферай яго праяўлення. Напрыклад, функцыянальны дыяпазон словаформы ў форме роднага склону *без + назоўнік* у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый выконвае сінтаксічныя функцыі: дапаўненне – азначэнне – прэдыкат і семантычныя: каўзатыў – прэдыкат: *Птушка нішто без песні. Чалавек –* ***без мары*** (А. Карпюк); *Гэты чалавек –* ***без мары****. І без надзеі* (В. Каваль); *Чалавек* ***без мары****… Нікчэмны. Пусты* (Янка Брыль). Бінарную парадыгму ўтвараюць кампаненты, што карэлююць з прэдыкатам, – адасобленыя азначэнні, дапаўненні і параўнанні: *За паваротам паказаўся малады лес. Потым стары сад,* ***пасаджаны да вайны*** (В. Каваль); *Мы ўбачылі хутарок, густа аздоблены зелянінай. Хвойны лясок быў маладым. Затое сад –* ***пасаджаны да вайны*** (Ю. Кулік). Функцыянальны дыяпазон словаформы абумоўлены не яе формай, а знешнімі фактарамі – здольнасцю структурных паказчыкаў фарміраваць разнастайныя сінтаксічныя сувязі ўзамен нейтралізаваных.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нязначныя кампенсаторныя ўласцівасці **логіка-семантычных фактараў** вызначаюць унікальны характар падобнай з'явы. У парадыгме такіх мадыфікацый і сінтаксічныя сувязі, і сінтаксічныя адносіны маюць пераменны характар, паколькі логіка-семантычнае ўзаемадзеянне паміж кампанентамі вызначае функцыю словаформы, якая кваліфікуецца як імпліцытная сінкрэтычная (форма і функцыі не супадаюць). Функцыянальны дыяпазон слваформы вызначаецца не толькі нейтралізацыяй першасных сінтаксічных сувязей і адносін і фарміраваннем новых, але і набытай імі ў выніку семантычнай імплікацыі.

Тыпалагічна істотная прыкмета – пераменны характар сінтаксічных сувязей і адносін – абумоўлена кантэкстуальнымі і логіка-семантычнымі фактарамі. Кантэкстуальныя фактары праяўляюцца ў прамой кампенсацыі эліпсаванага дзеяслова сродкамі кантэксту. Логіка-семантычныя фактары будуюцца на ўзаемадзеянні кампанентаў, пры якіх словаформа набывае новую імпліцытную функцыю. Поліфункцыянальны характар інфінітыва абумоўлены не толькі нейтралізацыяй першасных сінтаксічных сувязей і адносін і фарміраваннем новых, але і набытай імпліцытнай семантыкай. Функцыянальны дыяпазон інфінітыва ўключае 5 сінтаксічных функцый і 4 семантычныя, дзве з якіх кваліфікуюцца як імпліцытныя: *Сёстры хацелі адпачыць. Мы – **пагуляць*** – выказнік / прэдыкат; *Маці пайшла паліць гуркі. Бацька – **пакасіць*** – акалічнасць мэты / інфінітыў; *Вучні мелі жаданне пагуляць. Настаўнікі – **пачаць** заняткі* – азначэнне; *– Ты куды? – Толькі **паліць** капусту* – акалічнасць месца / лакатыў (імпл.); *– Ты надоўга? – Толькі **ўскапаць** грады* – акалічнасць часу / тэмпаратыў (імпл.).

Іменныя словаформы набываюць поліфункцыянальны характар дзякуючы спецыфічнаму семантычнаму напаўненню, якое абумоўлена як логіка-семантычнымі фактарамі, так і сінанімічнымі пераўтварэннямі. Спецыфічнасць семантычнага напаўнення заключаецца ў тым, што эліптычная канструкцыя з лакатывам тыпу *Мы – да бульбы* абазначае не толькі кірунак руху, але і працу на гэтым аб'екце. Такія з'явы складаюць канструкцыйна-семантычную адметнасць беларускай мовы. Функцыянальны дыяпазон слвоформ у парадыгмах вар'іруецца ў межах трох кампанентаў – прэдыкат, лакатыў, тэмпаратыў.

### 1.3.5 Механізмы рэгулявання кампенсаторнай функцыі кампанентаў у канструкцыях з эліпсісам дзеяслова

Сістэма моўных механізмаў адлюстроўвае законы і заканамернасці, што рэгулююць функцыянаванне канструкцый з эліпсісам дзеяслова. Кампенсацыя эліпсіса ажыццяўляецца з дапамогай моўных сродкаў розных узроўняў – сінтаксічнага, марфалагічнага, лексічнага, фанетычнага, таксама можа быць абумоўлена логіка-семантычнымі фактарамі (імпліцытная семантыка). Клас моўных механізмаў, што рэгулююць функцыянаванне эліптычных канструкцый, павод-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ